руюцца ў здольнасці. У сувязі з тым, што традыцыйная мастацка-творчая дзейнасць унікальна па сваей грунтоўнасці, можна выказаць думку, што дзіця фарміруе унікальныя творчыя здольнасці.

Паколькі унікальнасць - аспект безумоўна творчы, а засваенне сусвету дзіцем - аспект сацыяльны, таму дзіця, якое далучаецца ў сваце да сацыяльных каштоўнасцей, фарміруе свой творчы патэнцыял на базе унікальнасці, непаўторнасці сваей нацыянальнай культуры.

## КУПАЛЬСКАЕ СВЯТА І ЯГО РОЛЯ Ў ДУХОЎНЫМ АДРАДЖЭННІ БЕЛАРУСАЎ

Н.А.Міцкевіч

Купалле адзначалася з 23 па 24 чэрвеня і з'ўлялася самым насычаным абрадамі старажытным святам. Купалле складалася як урачыстасць у гонар летняга сонцастаяння. Гэта было свята найвышэйшага росквіту усіх зямных сіл. Галоўнае ў купальскіх абрадах - гэта культавая аснова, якая мела аграрную скіраванасць.

Адным з выходных момантаў абрадавага рытуалу з'яўляецца культавая паважанне раслін, а таксама дзвюх стыхій - агню, вады. Старажытныя продкі славян лічылі, што агонь гэта энергія сонца, таму пакланяліся яму, лічачы яго ахоўнікам жыцця на Зямлі. Пакланенне сонцу - найболей вядомая форма праяўлення купальскага культу. Безумоўна ахоўна-ачышчальны абрадавы сэнс мелі купальскія звычаі спальваць адзенне хворых дзяцей, скакаць праз палаючае вогнішча, кідаць галавешкі ў жыта, адпалохваючы пры гэтым злых духаў, ведзьмаў. Абрад спальвання жывога купальскага дрэва ўяўляе сабой некаторае падабенства са звычаямі пахавання. Тут прыкметны рысы карнавалізацыі, дзе культавая аснова зноў з'яўляецца ў форме маскі. У гэтым стане купальскае свята падобна да карнавалу. У паўднева-заходніх раенах Беларусі лічылась даўней традыцыяй спальванне лялькі-Купалы: яна ж ведзьмарка, чараўніца, русалка. Існуе таксама устойлівая традыцыя ў купальскую ноч прыбіраць рушнікамі і кветкамі "аброчныя крыжы". Характэрны ля купальскай карнавалізацыі маскі старога гарбатага дзеда, маскі дзеда і бабы, якія сваім абліччам нагадваюць

свята памінавання продкаў "Дзяды".

Культавая аснова была тым асяроддзем, у якім вырастала купальская карнавалізацыя. Гэта было тое паэтычнае успрыманне жыцця, якое мела гратэскавы густ. Купальскі карнавал - гэта гульня гратэскавых вобразаў, якія існуюць непасрэдна, шчыра паміж зялёных дрэў, траў, кветак. Паэтычны вобраз добрага купальскага дзеда з кошыкам кветак папараці таксама звязан з фантастычнымі прадстаўленнямі. Акрамя таго у паказах русалак, калдуноў, чараўніц, усялякай нечасці ёсць нешта пераасэнсаванае ад культа продкаў. У беларускай купальскай традыцыі праглядваецца далекая сувязь паміж ачышчальным рытуалам выгнання смерці і паказам фарсавых пахаванняў.

Такім чынам, элементы карнавалізацыі купальскіх абрадаў, тэатралізаваныя дзеянні, карагоды, гульні, рысы народнай пантамімы складаюць адзінае збіральнае паняцце "Купалле".

Свята гэта, як крыніца духоўнай культуры беларусаў, іграе вялікую ролю у адраджэнні народных святаў.

## БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР, ЯК АСНОВА СТВАРЭННЯ СУЧАСНАГА НАРОДНАГА СВЯТА

А.Г.Фядотаў

Значныя змены, якія адбываюцца у духоўным жыцці рэспублікі, кранулі і святочную культуру Беларусі. Разам з адраджэннем мовы, сваей праўдзівай гісторыі да нас вяртаецца сапраўдная народная культура - песні, гульні, легенды, паданні. Адзін з накірункаў працы нашай кафедры, гэта стварэнне народных святаў на падставе легенды і падання. Гэтыя старадаўнія гісторыі складалі своеасаблівую сістэму маральных каардынат, якою карысталіся наступныя пакаленні, каштоўнейшы вопыт, які выхоўваў душу, дапамагаў чалавеку зрабіць правільны выбар у складаных жыццевых сітуацыях.

Рэжысер свята мае рэдкую магчымасць перанесці запісанне на паперы легенды і паданні у самы гушчар сенняшняга жыцця і увасабіўшы у тэатралізаваную форму данесці да людзей іх эстэтычную і маральную каштоўнасць. І справа не у вонкавых рысах адлюстра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ